Исходя из перечисленного можно сделать следующий вывод: формирование профессиональных компетенций у студентов-вокалистов в рамках учебной дисциплины «Фортепиано» направлено на усвоение и развитие широкого спектра навыков и умений, необходимых для исполнительской деятельности в области музыкального искусства эстрады. В целом учебная дисциплина «Фортепиано» выступает как составная часть системы профессиональной подготовки студентов-вокалистов с целью дополнения и совершенствования ее содержания.

1. *Смирнова, И. А.* Развитие полифонического мышления как необходимое условие формирования профессиональных компетенций музыканта-исполнителя по специальности «Искусство эстрады» / И. А. Смирнова // Проблемы и перспективы развития высшего образования в сфере культуры и искусств : материалы науч.-метод. конф. профессорско-преподавательского состава учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск, 3 февр. 2022 г. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; редкол.: Н. В. Карчевская [и др.]. – Минск, 2023. – С. 422–427.

2. *Шмитц, М.* 25 джазовых инвенций для фортепиано / М. Шмитц. – М. : Классика XXI, 2004. – 45 с. – URL: https://notes24.ru/instrumentyi/fortepiano-sintezator-organ/populjarnaja-estradnaja-muzyka/shmitc-m-25-dzhazovyh-invencij-dlja-fortepiano.html (дата обращения 10.01.2024).

УДК [008+130.2]:167

***А. І. Смолік,***
*доктар культуралогіі, прафесар,*
*загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

## СІНАЛОГІЯ: ДА ПЫТАННЯ АБ ЯЕ МЕТАДАЛАГІЧНЫМ СТАТУСЕ

**Анатацыя.** Прадстаўлены тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да вызначэння сутнасці і праблемнага поля сіналогіі як галіны культуралагічных ведаў аб кітайскай цывілізацыі і культуры. Абгрунтоўваецца меркаванне, што навука аб культуры і цывілізацыі Кітая павінна называцца сіналогіяй як найбольш адпавядаючая сацыяльна-культуразнаўчай навуковай і вучэбнай дысцыпліне. Асноўнымі складнікамі яе зместу павінны быць веды аб гісторыі кітайскай культуры і цывілізацыі, жыцці этнасаў, рэлігіі, эканамічным і дзяржаўным будаўніцтве, мове, навукова-

тэхнічных дасягненнях, мастацкай творчасці кітайцаў, іх унёску ў развіццё чалавечай супольнасці.

**Ключавыя словы:** сіналогія, культура, цывілізацыя, гісторыя, лад жыцця, этнасы, менталітэт, міфалогія, рэлігія, мастацтва, адукацыя.

***A. Smolik,***
*Doctor of Cultural Studies, Professor,*
*Head of the Department of Cultural Studies*
*of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

## SINOLOGY: ON THE ISSUE OF ITS METHODOLOGICAL STATUS

**Abstract.** The article presents theoretical and methodological approaches to the definition of the essence and problem field of sinology as a branch of cultural knowledge about Chinese civilization and culture. The author justifies the opinion that the science of Chinese culture and civilization should be called Chinese studies as the most adequate socio-cultural scientific and educational discipline. The main components of its content should be knowledge about the history of Chinese culture and civilization, life of ethnic groups, religion, economic and state construction, language, scientific and technical achievements, artistic creativity of the Chinese, their contribution to the development of human society.

**Keywords:** sinology, culture, civilization, history, lifestyle, ethnic groups, mentality, mythology, religion, art, education.

Фарміраванне ўсіх навук пачынаецца з утварэння паняццяў. Дадзеная дэфініцыя ўведзена ў гуманітарны дыскурс нямецкім філосафам Г. Рыкертам (1863–1936). На яго думку, яно пазначае тую асаблівасць паняційных структур, згодна з якой у любым паняцці абавязкова павінна адлюстроўвацца спецыфічная тэлеалогія [6]. Паняцці, у сваю чаргу, утвараюць катэгарыяльны апарат навукі і вучэбнай дысцыпліны, які, як мяркуе расійскі культуролаг А. Я. Фліер, уяўляе сабой найбольш фундаментальнае, субстанцыянальнае і субстратнае разуменне грамадскіх, эканамічных, прыродных і культурных з'яў, працэсаў і сувязей, на падставе якога ажыццяўляецца сістэматызацыя вывучаемых феноменаў і распрацоўваюцца метадалогія і метады разумення [9].

Сіналогія як навуковая і вучэбная дысцыпліна фарміравалася і працягвае развівацца на стыку гуманітарных, сацыяльных, эканамічных і навукова-тэхнічных ведаў аб прыродных і грамадскіх з'явах і працэсах, якія адбываліся і сёння пануюць у айкумене Паднябеснай. Такім чынам, «Сіналогія», з'яўляючыся

вучэбнай дысцыплінай, прадугледжвае сістэмнае выкладанне аб'ектыўных ведаў аб гісторыі кітайскай культуры і цывілізацыі, ладу жыцця этнасаў, іх рэлігіі, эканамічным і дзяржаўным будаўніцтве, мове, навукова-тэхнічных дасягненнях, мастацкай творчасці кітайцаў, іх укладзе ў развіццё чалавечай супольнасці і інш. Сіналогія імкнецца да аб'яднання пазначаных кампанентаў жыццядзейнасці суб'ектаў кітайскай цывілізацыі.

Сёння існуе мноства паняццяў навукі аб цывілізацыі і культуры Кітая. Дадзеную сацыяльна-гуманітарную навуку, як мяркуюць некаторыя грамадазнаўцы, патрэбна адносіць да галіны ўсходазнаўства. У такім выпадку сіналогія павінна ўяўляць сабой комплекс ведаў аб гісторыі, культуры, палітыцы, філасофіі, эканоміцы і мове старажытнага і сучаснага Кітая. У некаторых краінах навукоўцы карыстаюцца такімі тэрмінамі, як кітаістыка або кітаязнаўства. Кітайскія даследчыкі аддаюць перавагу тэрмінам *піньінь hàпхиé* або *піньінь guóхиé*, што ў перакладзе на беларускую мову абазначае «*радзімазнаўства*». *Піньінь hàпхиé* выкарыстоўваецца навукоўцамі пры даследаванні гісторыі і культуры нацыянальнасці *хань*, якая складае звыш 90 % ад усяго насельніцтва КНР. Пры вывучэнні культуры астатніх нацыянальнасцей, якія пражываюць на тэрыторыі Кітая, перавага аддаецца выкарыстанню тэрміна *пінь guóхиé*. У Японіі дадзеная галіна ведаў пазначаецца дэфініцыяй *кангаку* (ханьскае вучэнне). У англамоўным варыянце навуку аб Кітаі прынята называць *Chinese Studies*. У XIX ст. навукоўцаў, якія вывучалі Кітай нярэдка называлі хінезістамі. А ў XXI ст. даследчыкаў кітайскай цывілізацыі называюць сінолагамі, кітаістамі або кітаеведамі.

На постсавецкай еўрапейскай прасторы найбольш ужывальным у адносінах да навукі аб Кітаі служыць дэфініцыя «*сіналогія*» (ад познелацінскага Sina і ...logia).

Улічваючы, што навука аб культуры ва ўстанове адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» з'яўляецца ў асноўным вучэбнай дысцыплінай і, зыходзячы асабліва з гуманітарнага профілю ўстановы вышэйшай адукацыі, мяркуем, што вучэбная дысцыпліна аб культуры і цывілізацыі Кітая павінна называцца сіналогіяй, як найбольш адпавядаючая сацыяльна-культуразнаўчай вучэбнай дысцыпліне.

Падрыхтоўка студэнтаў па прафілізацыі «Сіналогія» ўваходзіць у спецыяльнасць «культуралогія». Такім чынам, «Сіналогія» з'яўляецца галіной культуралагічных ведаў. Культуру як іманентны аспект любой спецыялізаванай і неспецыялізаванай чалавечай дзейнасці вывучаюць усе гуманітарныя і сацыяльныя навукі. Аднак уласна культуралагічнымі дысцыплінамі з'яўляюцца толькі тыя, у якіх культура вывучаецца як цэласны і непасрэдны аб'ект пазнання, у якіх рэканструкцыя і мадэляванне ажыццяўляюцца на падставе вербальных і невербальных тэкстаў культуры і разглядаюцца ў спецыфічных рысах тэхналогій і артэфактаў.

Структурна культуралагічныя дысцыпліны можна пазначыць 3 намінацыямі: а) гуманітарна-культуразнаўчыя, якія ў асноўным вывучаюць фенаменалагічную сутнасць артэфактаў культуры, і іх класіфікацыя ажыццяўляецца па знешніх атрыбутыўных прыметах; б) сацыяльна-культуразнаўчыя, у якіх утрымліваюцца навуковыя веды аб сістэматызацыі культурных з'яў і працэсаў па іх сутнасных прыметах, іх генезісе і функцыях, а таксама аб месцы і ролі ў сістэме некаторых з'яў і феноменаў; в) прыкладныя культуралагічныя дысцыпліны, у якіх прадстаўлены веды аб тэхналогіях і метадах трансляцыі культурных каштоўнасцей і норм, іх засваенне і прымяненне ў дзеяннях і паводзінах асобы.

Такім чынам, на наш погляд, статус сіналогіі найбольш адпавядае сацыяльна-культуразнаўчай вучэбнай дысцыпліне. Тым больш, што ў пачатку сістэмнае даследаванне кітайскай цывілізацыі, якое пачалося ў другой палове XIX ст., канцэнтравалася больш на аспектах духоўнага жыцця кітайскага народа.

Станаўленне навуковай дысцыпліны прыпадае галоўным чынам на XX ст. У гэты перыяд вывучэнне кітайскай цывілізацыі і культуры як самастойнай дысцыпліны паступова вылучылася ў спецыфічны профіль сацыяльна-культуразнаўчых ведаў, што фарміраваліся як кітайскімі, так і замежнымі даследчыкамі. Пры гэтым эмпірыка-сістэматычным вывучэннем феноменаў кітайскай цывілізацыі і культуры як цэласнасці займаліся гісторыкі, літаратуразнаўцы, міфолагі, псіхолагі і філосафы Кітая. Ля вытокаў сіналогіі знаходзіліся такія вядомыя кітайскія даследчыкі, як Ван Сяо Лянь [15], Вень Ідо [16], Гао Йоу Пен і Фан Мен [17], Лен Дэ Сі [18], Лю Дунь Юань [19], Фэн Цзіцай [20] і інш. Іх даследаванні будаваліся не толькі

ў традыцыйнай манеры, – у працах названых сінолагаў з'яўляецца шмат новых матэрыялаў, невядомых у папярэднія дзесяцігоддзі. Пры трактоўцы многіх з'яў і сацыякультурных працэсаў імі прыводзіліся фрагменты са старажытных крыніц, на аснове якіх яны стваралі асабістыя канцэпцыі. У навуковых пошуках кітайскія даследчыкі абапіраліся на тэарэтыка-метадалагічныя падыходы еўрапейскіх сінолагаў.

У гэты час вывучэннем кітайскай цывілізацыі інтэнсіўна займаўся шэраг заходнееўрапейскіх і амерыканскіх навукоўцаў. Сярод іх найбольш фундаментальныя працы прадстаўлены М. Гранэ [13], А. Масперам [14], С. Франк [12] і інш.

Важкі ўклад у станаўленне навукі аб кітайскай культуры і расійскіх навукоўцаў. Так, ужо ў 1892 г. С. М. Георгіеўскі падрабязна выклаў старажытныя ўяўленні кітайскага народа аб стварэнні свету, сутнасці паданняў аб незвычайным нараджэнні імператараў Старажытнага Кітая [1]. На ўзроўні навукі свайго часу М. П. Мацокіным напісаны шэраг артыкулаў, у якіх упершыню інтэрпрэтавалася праблема аб існаванні ў Кітаі мацярынскага роду на прыкладзе жаночага вобраза героя Нюйвы і перажыткаў татэмізму ў традыцыі аб старажытных мудрых продках кітайцаў [5].

У савецкі перыяд вывучэннем старажытнакітайскай гісторыі культуры займаліся такія расійскія навукоўцы, як У. В. Адамчык, Д. В. Дэопік, І. М. Дыяканаў, А. М. Залатароў, А. М. Карапецянц, І. С. Лісевіч, А. М. Лобак, А. Я. Лук'янаў, Л. С. Пераломаў, А. А. Серкіна, Р. Р. Стратановіч, Э. М. Яншына, В. У. Яўсюкоў і інш. [4].

Асобныя аспекты кітайскай культуры таксама закраналі ў даследаваннях такія беларускія навукоўцы, як Т. І. Шамякіна [10], В. У. Старасценка [8]. Адметныя рысы кітайскай культуры разглядаюцца ў вучэбнай літаратуры І. У. Казаковай [2], Л. К. Кухто і С. Л. Шпарло [7], Я. І. Шыршова [3], В. Р. Языковіча [11] і інш.

Такім чынам, намаганнямі кітайскіх і замежных навукоўцаў удалося вызначыць асноўнае праблемнае поле і статус сіналогіі як галіны сацыяльна-культуразнаўчага дыскурсу.

---

*1. Георгиевский, С.* Мифические воззрения и мифы китайцев (с табл. китайских иероглифов) / С. Георгиевский. – СПб. : Тип. И. Н. Скороходова, 1892. – 117 с.

2. *Казакова, И. В.* История и теория мировой культуры : учеб.-метод. пособие / И. В. Казакова (авт.-сост.). – Минск : Зорны Верасок, 2010. – 664 с.

3. Культурология: теория и история культуры : учеб. пособие для вузов / Е. И. Ширшов, К. И. Баландин, В. В. Качановский, И. М. Клецова ; под общ. ред. Е. И. Ширшова. – Минск : БГЭУ, 2004. – 543 с.

4. *Лю Янь.* Персонаж белорусской и китайской мифологии как первотворец и транслятор артефактов культуры: сравнительно-типологический аспект / Лю Янь. – Минск : А. Н. Вараксин, 2018. – 256 с.

5. *Мацокин, Н. П.* Мифические императоры Китая и тотемизм / Н. П. Мацокин // Сборник статей профессоров и студентов, приуроченный к XVIII-ой годовщине основания Восточного института / ред. комис.: И. Ф. Ливин [и др.]. – Владивосток, 1917. – С. 46–48.

6. *Риккерт, Г.* Науки о природе и науки о культуре / Г. Риккерт // Культурология. XX век : антология / сост. С. Я. Левит. – М., 1995. – С. 69–103. – (Лики культуры).

7. *Смолік, А. І.* Культуралогія: тэорыя культуры : вучэб.-метад. комплекс / А. І. Смолік, Л. К. Кухто, С. Л. Шпарло ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2017. – 343 с.

8. *Старостенко, В. В.* Религиоведение : учеб. пособие / В. В. Старостенко. – Могилев : МГУ им. А. А. Кулешова, 2005. – 300 с.

9. *Флиер, А. Я.* Культурология для культурологов : учеб. пособие для магистрантов и аспирантов, докторантов и соискателей, а также преподавателей культурологии / А. Я. Флиер. – М., 2000. – С. 245–247.

10. *Шамякина, Т. И.* Китайский миф о Потопе / Т. И. Шамякина // Эсхатология (Мифы о Потопе) : учеб. пособие для самостоятельной работы студентов филол. ф-та БГУ по курсам «Славянская мифология», «Восточная мифология» / Т. И. Шамякина. – Минск, 2007. – С. 17–21.

11. *Языкович, В. Р.* Культурология : учеб.-метод. пособие / В. Р. Языкович. – Минск : РИВШ, 2010. – 364 с.

12. *Frank, Sybille.* Wall Memorials and Heritage / Sybille Frank ; translated into English by Jessica Spengler. – New York : Routledge, 2016. – 282 p.

13. *Granet, M.* Études sociologiques sur la Chine / M. Granet. – Paris : Presses Universitaires de France, 1953. – XX, 301 p.

14. *Maspero, A.* Legendes mythology quesdans le Chou king / A. Maspero // J. Asiat. – 1924. – Vol. 204, Jan.-Mars. – P. 1–100.

15. 王孝廉. 水与水神 / 王孝廉. – 北京 : 学苑出版社， 1994. – 190 p. = *Ван Сяо Лянь.* Вода и водяные божества / Ван Сяо Лянь. – Пекин : Академическое изд-во, 1994. – 190 с.

16. 闻一多. 神话与诗 / 闻一多. – 上海 : 华东师大出版社， 1997. – 331 p. = *Вень Идо.* Мифология и стихосложение / Вень Идо. – Шанхай : Изд-во педагогического ун-та Хуа Донг, 1997. – 331 с.

*17.* 高有鹏. 神话之源 – 海经与中国文化 / 高有鹏, 芳孟. – 开封， 河南大学出版社， 2001. – 309 р. = Гао Йоу Пен. Мифы и легенды : Книга гор и морей в китайской культуре / Гао Йоу Пен, Фан Мен. – Кайфэн : Изд-во Хэнаньского ун-та, 2001. – 309 с.

*18.* 冷德熙. 超越神话. 纬书政治神话研究 / 冷德熙. – 东方出版社， 1996. – 367 р. Лен Дэ Си. Мифология. Исследование политической составляющей в мифологии / Лен Дэ Си. – Донфанское изд-во, 1996. – 367 с.

*19.* 刘敦元. 古代艺术与古代文明的研究 / 刘敦元. 台北 : 云城文化出版社， 1994. – 452 р. = Лю Дунь Юань. Исследование древних искусств и древней цивилизации / Лю Дунь Юань. – Тайбэй : Изд-во культуры Юн Ченьвг, 1994. – 452 с.

*20.* 冯骥才. 中国民俗艺术 / 冯骥才. – 北京 : 华语教学出版社， 2016. – 451 р. = Фэн Цзицай. Китайское искусство фольклора / Фэн Цзицай. – Пекин : Изд-во обучения китайском языку, 2016. – 451 с.

УДК 378:[001.89:316.77]

***Т. М. Смоликова,***

*кандидат культурологии, доцент, доцент кафедры межкультурных коммуникаций и рекламы учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

# ПРОЕКТНАЯ МОДЕЛЬ ОРГАНИЗАЦИИ НАУЧНО-ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ ЛАБОРАТОРИИ «ТЕХНОЛОГИИ КОММУНИКАЦИЙ» С ЦЕЛЬЮ ПОВЫШЕНИЯ КАЧЕСТВА ПРАКТИКО-ОРИЕНТИРОВАННОЙ ПОДГОТОВКИ СПЕЦИАЛИСТОВ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ

**Аннотация.** Обосновывается проблема взаимосвязи практико-ориентированной подготовки специалистов высшего образования с возможностью реализации их творческого потенциала в проектной деятельности учреждений высшего образования. Предлагается модель организации научно-образовательной лаборатории «Технологии коммуникаций», деятельность которой будет способствовать формированию профессиональных компетенций, объединению интеллектуальных и творческих потенций, реализации междисциплинарных научно-исследовательских программ, повышению качества образовательных услуг.

**Ключевые слова:** коммуникации, научно-исследовательская деятельность, практико-ориентированное обучение, творчество, проектная деятельность, жизненный цикл и этапы проекта.